**Установа адукацыі**
**«Беларускі дзяржаўны педагагічны**
**ўніверсітэт імя Максіма Танка»**

Філалагічны факультэт
Кафедра беларускай літаратуры і культуры

# ЧАРНОБЫЛЬСКАЯ ТЭМА Ў БЕЛАРУСКАЙ ПАЭЗІІ

| | |
|---|---|
| | Курсавая работа |
| Дапушчана да абароны | студэнткі 21 групы |
| | 2 курса спецыяльнасці |
| | «Беларуская мова і літаратура» |
| Загадчык кафедры ______ | дзённай формы |
| _________ | атрымання адукацыі |
| | _________Карповіч |
| Пратакол №_____ад _______2016 г. | Веранікі Анатольеўны |
| | |
| | Навуковы кіраўнік – |
| Абаронена _______________2016 г. | кандыдат філалагічных |
| з адзнакай | навук, дацэнт |
| «____________________» | __________Н.В. Заяц |

Мінск, 2016

**ЗМЕСТ**

УВОДЗІНЫ ………………………………………………………..……………3

РАЗДЗЕЛ  I Спецыфіка засваення чарнобыльскай тэмы
беларускай лірыкай…………………………………………………………….5

РАЗДЗЕЛ II Адметнасці мастацкага ўвасаблення чарнобыльскай
тэмы ў паэтычным эпасе ……………………………………………………..16

ЗАКЛЮЧЭННЕ…………………………………………………………………24

БІБЛІЯГРАФІЧНЫ СПІС……………………………………………………..

# УВОДЗІНЫ

Чарнобыль... У назве гэтага старажытнага горада быццам нейкае змрочнае прадказанне. Было, быль... Але, нажаль, Чарнобыль – гэта не быль сівых вякоў, не мінуўшчына, гэта сучаснае. Чарнобыль – горыч усяго народа. Чарнобыль – гэта страх псрад будучыняй, страх за дзяцей, унукаў. Чарнобыль – гэта вайна, якую нельга спыніць. Чарнобыль – адвечны боль за зямлю, Бацькаўшчыну.

Страшная, балючая рэчаіснасць патрабуе новых поглядаў і падыходаў да праблемы Чарнобыля, яо асэнсавання. І ў гэтым плане значная роля належыць мастакам слова. Беларускія паэты і пісьменнікі зведалі і боль, і горыч, пошукі ісціны, праўды пра вялікую бяду ў нашым краі.

Вясна заўсёды цешыць душу, нясе радасць, надзею. З кожнай вясной чалавек як бы нараджаецца занава. Вясна ж 1986-га прынесла бяду. Гэты год, як калісьці ваенны 1941-ы, прайшоўся пякучым болем па лёсе амаль кожнага беларуса, усклаў на плечы яшчэ адно выпрабаванне, прымусіў іншымі вачыма глянуць вакол сябе.

Аднойчы ўзышла над Беларуссю чорная зорка Чарнобыля, цяжарам легла на душы, жудасным болем і страхам адбілася на тварах дзяцей. Восемдзесят шосты... Што зрабіў ён з маёй «зямлёй пад белымі крыламі» ? Чаму не падумаў пра таго, хто, як лісток, адарваны ад дрэва, жыве не ў родным кутку, і нідзе няма яму шчасця, бо вецер часу падхапіў яго і нясе па свеце.

І зусім па-іншаму глядзім мы сёння на знаёмыя абрысы карты Беларусі. Цяпер ужо чорнымі плямамі афарбаваны яны. А ў іх Хойнікі, Брагін, Краснаполле, Чачэрск... І часцей ужо можна пачуць выразы «зона забруджання», «зона адсялення»... А чым вымераць гора людзей, якія вымушаны пакінуць магілы родных, хаты дзяцінства, вёскі, дзе кожны сусед быў братам? Багаты залескі край аказаўся безабаронным і сам пачаў несці пагрозу людзям. І ўжо пустымі аканіцамі сустракаюць часцей пакінутыя вёскі. Пустазеллем пакрыліся палеткі, галасы птаства ўжо не вабяць чалавечыя душы...

Для Беларусі і чалавецтва пачалося жыццё пасля Чарнобыля. А. Адамовіч, выступаючы ў Японіі ў красавіку 1990 г., сказаў пра трагічны разлом часу: «Да Чарнобыля і пасля Чарнобыля – гэта рознае светаадчуванне, гэта па-новаму небяспечныя шляхі чалавецтва ў будучыню» («Апакаліпсіс па графіку»). Тое ж гаворыць і С. Алексіевіч у «Чарнобыльскай малітве»: «Пасля Чарнобыля жывём у іншым свеце, ранейшага свету няма»; «...Чарнобыль перамясціў нас з аднаго часу ў другі. Перад намі рэальнасць,

новая для ўсіх...» Чарнобыльская трагедыя стала знакавай падзеяй XX стагоддзя, яе паставілі ў адзін шэраг з такімі трагедыямі, як вайна, Хатынь, Асвенцім, Хірасіма і Нагасакі.

Толькі праз тры гады беларусы на поўны голас загаварылі пра жахлівую катастрофу XX стагоддзя – Чарнобыль. Хоць і са спазненнем, але прыйшло на родную зямлю слова Праўды. Адчайны чалавечы крык аб помачы і паратунку стаў шырока чутны дзякуючы дзейнасці народных дэпутатаў, сумленнаму голасу вучоных і пісьменнікаў. Асабліва магутны грамадскі рэзананс атрымала маніфестацыя «Чарнобыльскі шлях» у Мінску. І сёння Чарнобыль стукае ў сэрцы кожнага з нас... Жыццё пасля Чарнобыля. Яно доўжыцца больш за дваццаць гадоў. Катастрофа не забываецца, але пачынае ўспрымацца як наканаванасць у шэрагу іншых гістарычных нягод. Цяжка прыходзіць усведамленне, што гэтая трагедыя – непапраўная, што яна вымагае не толькі перабудовы нашага мыслення, але і ўсяго жыцця.

У беларускай літаратуры з’явілася шмат мастацкіх твораў на тэму Чарнобыля. Паэзія як чуйны барометр часу аператыўна рэагуе на жыццё. Таму невыпадкова, што першымі да засваення гэтай тэмы звярнуліся паэты.

**Мэта курсавой работы** – даследаваць спецыфіку раскрыцця чарнобыльскай тэмы ў беларускай паэзіі.

Дасягненне пастаўленай мэты патрабуе рэалізацыі наступных **задач**:

1) вывучыць крытычную літаратуру па тэме даследавання;
2) прааналізаваць адметнасць мастацкага ўвасаблення чарнобыльскай катастрофы ў беларускай лірыцы;
3) даследаваць асаблівасці творчага рскрыцця праблемы Чарнобылю ў паэтычным эпасе.

**Прадмет даследавання** – праблема чарнобыльскай катастрофы ў рэцэпцыі беларускіх паэтаў.

**Аб’ект даследавання** – творы М. Мятліцкага, Я. Сіпакова, С. Законнікава, В. Зуёнка, Р. Барадуліна, П. Панчанкі, А. Вялюгін, М. Танка, А. Каско, В. Яраца, М. Арочкі, А. Разанава і інш.

Курсавая работа складаецца з уводзін, двух раздзелаў (“Спецыфіка засваення чарнобыльскай тэмы беларускай лірыкай”, “Адметнасці мастацкага ўвасаблення чарнобыльскай тэмы ў паэтычным эпасе”), заключэння і бібліяграфічнага спіса.

## РАЗДЗЕЛ I Спецыфіка засваення чарнобыльскай тэмы беларускай лірыкай

Пасля чарнобыльскай катаствофы ў зоне адчужэння і адсялення засталіся родныя вёскі многіх беларускіх пісьменнікаў, напрыклад, І. Мележа (Глінішча) і М. Мятліцкага (Бабчын). Менавіта ў творчасці аўтараў, выхадцаў з гомельскага Палесся, якое найбольш пацярпела ад чарнобыльскай аварыі, тэма атамнай катастрофы гучыць найбольш балюча. Пляменніца І. Мележа Лілія Мележ напісала гімн малой радзіме пісьменніка:

Край мой непаўторны
Зямля паэтаў, спевакоў, надзей...
Я тут з'явілася на свет
Пад недам зорным
І не жадала б болей жыць нідзе! [5. с. 87].

М. Мятліцкі аднойчы сказаў, што паэтам яго зрабіў Чарнобыль. Напэўна, гэта так. Паслячарнобыльскія кнігі паэзіі («Шлях чалавечы», «Палескі смутак») – гэта памяць жывога жыцця на зямлі. Іх шчымлівыя вершы асабліва кранаюць і трывожаць, бо да драбніц уваскрашаюць страчанае, вяртаюць у родныя мясціны.

Гаворка пра чарнобыльскую бяду стала балючай тэмай для паэта М. Мятліцкага. Яго родная вёска Бабчын на сённяшні дзень – мёртвая, адзічэлая зона, дзе сярод пустых хат і двароў галоўныя гаспадары – вецер або цішыня. Развітанне з роднымі мясцінамі выклікала ў душы паэта невымерную горыч пакуты. Ён не жадае мірыцца з няўдзячным, суровым прысудам лёсу: «Кут мой забыты, безабаронна // Зорак пагаслых крыніц вачыма. // Некаму ты – Ачужэлая зона, // Сэрцу майму ты да скону – // Радзіма!» («Кут мой забыты, безабаронна...»).

У зборніку «Чарнобыльская рана», складзеным М. Мятліцкім, пададзены многія аспекты праблем, прынесеных на нашу зямлю жудаснымі наступствамі самай маштабнай тэхнагеннай катастрофы XX стагоддзя. Аўтары – навукоўцы і медыкі – даюць парады па выжывынні нацыі, дэманструецца кола гаспадарчых клопатаў…

Лёс землякоў паэта людзей выклікае толькі спачуванне. Праблема, узнятая ў зборніку «Чарнобыльская рана», актуальная і блізкая кожнаму – і таму, хто абараняў нашых беларусаў, ад чарнобыльскага атама, і таму, хто аказаўся падвергнуты яго наступствам, і любому жыхару Беларусі.

Глянуў за Прыпяць – вогненна шызы.
Па-над рэактарам слуп на ўсё неба.
Сціслася сэрца, ўздрыгнула нема.

Горкую сліну каўтаў да ікоты:
Ўсцяж на рэактар ішлі верталёты [19, с. 182].

Мікола Мятліцкі піша ў творы «Горычны маналог»:

Кожны бязбожнік дзякаваў Бога –
Чэрава смерці утаймавана.
Стыла павольна чутая рана.
Ў дзень той прачорны, з бядой заручоны,
Хойнікі ўсталі на ўскраіне зоны [19, с.123].

У многіх вершах М. Мятліцкага – жыццё «павернута памяці цудам» («Не выстыла памяць. Трапёткая, гойна жывая...»). Жыць «горкай праўдай», «пакутай радзімага краю» – суровая наканаванасць лёсу, таму журботна-элегічны пафас наскрозь пранізвае ўсе кнігі М. Мятліцкага. Паэт, укрыжаваны бядой, не стрымлівае боль і выгуквае: «Бачыць Бабчын такім не магу! // Ноч, адступіся!..» («Сонца, скаціся з неба хутчэй...»). Чарнобыль – чорны крыж паэта, які ён нясе са скаргай на свет цэлы. Нясе, выгаворваючы боль народны. Дзеля таго (калі праводзіць паралель з вершам Купалы «А хто там ідзе?» і перафразаваць яго), каб людзьмі застацца. Каб «збудзіцца ад сну», каб родны край «з вечнасцю гаварыў... галасамі людзей» (вершы «Апошні Бабчына жыхар...», «Час»).

У мастацкім уяўленні Чарнобыль найперш асацыіруецца са смерцю. Гэта яна зрабіла людзей сваімі ахвярамі, нясе пакуты і гора. Згасла жыццядайная сіла зямлі, затое паўсюль раскашуе трава нябыту і забыцця. Смерць з верша М. Мятліцкага «Я ценем быў...» паўстае нібы злая чараўніца, якая набыла свае ўладанні і ўладу:

І смерць
Шаптала ў ціішыні:
– Я тут адна,
Нябачна дна
Маіх магіл,
Канца дарог.
Жыццё – мана.
Яму цана –
Асот, крапіва
І быльнёг!
«Я ценем быў...» [4, с. 200].

Чарнобыль завастрыў праблему супрацьстаяння жыцця і смерці, і гэты міфалагічны антынамізм вызначальны ў многіх паэтычных творах. «Апошні Бабчына жыхар...» – так адчувае сябе герой М. Мятліцкага, які сам-насам сустракаецца ў зоне са смерцю: «Жыццё не вернецца назад, // Тут смерці

вечнае жніво!» Паэта паказаў, у што ператварыла свае ўладанні гэтая хціваая драпежніца. Тут усё дзеецца так, як у іншасвеце:

Ў дзічэўі па зрошанай шчэці-траве,
Па хвалях нябачных нейтронаў
Вёснам насустрач маім плыве
Човен Харона...
«Ў дзічэўі па зрошанай шчэці -траве...» [4, с. 201].

Жывога чалавека палохае жах чарнобыльскай смерці, яе злавесна-чорнае аблічча:

Смерць устала да зор у атручаным Бабчыне
І зрывае іх з неба кашчавай рукой.
«На аброшаным цэзіем лісці трыпутніку...» [4, с. 201].

Паэт малюе касьбу смерці падкрэслена гіпербалізавана, паказвае містэрыйную дзею як фатальную згубу. Смертаносная радыяцыя спляжыла прыродны свет, загубіла жыццятворны чалавечы пачатак, яна ператварыла свет у абшары смерці і цемры, «чорнае пекла». Невыпадкова тут усё змрочнае і жудасна-жахлівае: чорная рака з амярцвелымі водамі, пустэчы агалошваюць крумкачы, «зданямі чорнымі кружаць наўзбоч чэрці» (М. Мятліцкі. «Чорны асфальт падэшвы пячэ...»).

Не толькі ўраджэнцы мясцін, якія найбольш пацярпелі ад выбуху на атамнай станцыі, выступілі з эмацыйнымі паэтычнымі водгукамі на гэтую трагедыю. У творчасці бадай кожнага беларускага паэта знойдуцца вершы, прысвечаныя гэтай праблеме.

Маштабы экалагічнай катастрофы выразна ўяўляе паэт Пімен Панчанка ў вершы «Аб самым смачным...». Ён даводзіць, што Чарнобыль нясе смерць і малому, і вялікаму. Забруджаныя радыяцыяй воды Прыпяці, плынь шматлікіх рачулак, атручаныя крыніцы, ручаі панеслі смяротны яд генафонду прыроды:

Тут пахне Хірасімай.
Няма слядоў буслiных
І ласіных:
Над Прыпяццю –
Нябачнай смерці след [1, с. 32].

Рыгор Барадулін таксама адгукнуўся на чарнобыльскую трагедыю, якую часта называюць беларускай Хірасімай. Рыгор Іванавіч задаецца пытаннем: ці не стане чарнобыльская бяда ракавой, апошняй для беларусаў? Гэта пытанне робіцца эпіцэнтрам у паэзіі Рыгора Баралуліна, у яго зборніках «Самота паломніцтва» (1990), «Міласэрнасць плахі» (1992).

У вершы «Дазвол» паэт з горкай іроніяй гаворыць пра набалелае:

На час галоснасці
Мы атрымалі дазвол
Галасіць бабрамі па роднай мове.
Няхай лебядой зарастае падзол,
Няхай там народ будзе гол як сакол,
Мы боб сваіх слёз збіраць у прыпол,
Як піянеры, заўжды наўзгатове след [, с.].

Трагічная безвыходнасць чуецца  і ў наступных радках:

Ад радыяцыі
Беларусь гарыць.
Ці будзе, наогул,
Каму гаварыць? [, с.].

У вершы «Жалоба» ён абвінавачвае людзей, што стварылі атамныя станцыі і паставілі пад пагрозу жыццё мільёнаў людзей. Тлумачыць становішча беларусаў у свеце паэт у вершы «Перасцярога»:

Жывём мы на гэтым свеце
Заложнікамі бяды.
Пылінкі, пылінкі, пылінкі,
Імглінкі надзей і людзей.
У небе з дрыготкай былінкі
Страсаецца знічка радзей,
Яна да зямлі дакрануцца
Баіцца,
А можа, зусім
Не хоча,
Бо ліўні лінуцца –
Прыспешнікі лютасных зім [, с.].

У вершы «Малітва наступнасці» Р. Барадулін ставіць побач такія словы, як радыяцыя і радаўніца, радыеактыўныя хмары і хусціна Бога, чыстая Беларусь і Беларусь у стронцыі і цэзіі. Чытач павінен убачыць малюнак атручанай, засыпанай радыеактыўным попелам беларускай зямлі:

Хай свяціцца імя Твае,
У палыновым вянку
Гаратніца.
Хай цвіце твой дзядоўнік
Калючы, таму што безабаронны.
У цябе на слыху перагукваюцца
Радыяцыя і радаўніца.
Чакаючы ў гнёзды буслоў,

Дагніваюць на ліпах бароны.
Хай свЯціцца імя Твае,
Маці сумная!
Хмару радыеактыўную
Хусцінай ад Бога
Ты на самыя вочы насунула –
Не чуеш, не бачыш
Нічога [, с.].

Бяда – нахабная і паўнапраўная гаспадыня, якую прывёў «дух злы» на беларускую зямлю. Яна зруйнавала народнае жыццё, правіць свой баль, ладзіць хаўтуры. «Атам зрабіў Беларусь удавою», бездапаможнай перад чарнобыльскай навалай. У вершы Рыгора Барадуліна «Жалоба» бяда – канцэнтрацыя негатыву і сімвал разладу, занядбання, трагедыі:

А ва ўдавы
Не зачыняюцца хлявы,
Павыпушчана гавяда,
Статак пасвіць бяда.
А ва ўдавы
Някошаны паплавы
І пожні някошаны.
Госці запрошаны
З ласкі бяды.
На Дзяды [4, с. 197].

Пазней з'явіліся творы А. Вялюгіна («Вясна трывогі нашай»), М.Танка («Пасля аварыі»), В. Зуёнка («Касмічная вестка», «Атамная малітва»), У. Някляева («Зона»), С. Законнікава («Чорная быль»), Я. Сіпакова («Одзіум»), А. Зэкава («Аварыя сумлення») і інш.

Варта падкрэсліць, што ў беларускай літаратуры яшчэ задоўга 1986 года з’яўляліся творы-прадбачанні чарнобыльскай катастрофы. Так, В. Зуёнак за тры дзесяцігоддзі да Чарнобыльскай трагедыі ў вершы “Ідуць дажджы” (1964) “разгледзеў” яе наступствы. Эпіграфам да твора Васіль Зуёнак узяў радкі Аляксандра Блока “В последний раз – опомнись, старый мир!” Ужо эпіграф гаворыць пра сацыяльную ангажаванасць верша, указвае на агульнаграмадскую значнасць лірычнага перажывання аўтара. Анафарычная кампазіцыйная арганізацыя верша, размеранае паўтарэнне радкоў “Ідуць дажджы” стварае эфект гадзінніка, які адлічвае час чалавечай цывілізацыі. “Ідуць дажджы. А травы жухнуць, / Грыбы хаваюцца ў зямлю. / Ідуць дажджы злавесна, глуха / Рунь заганяюць у раллю. / Ідуць дажджы. А птушкі млеюць / І нема падаюць на дол. / Ідуць дажджы... І ліст ліліеі / Над

смерцю рыб – хаўтурны стол” (30). Драматычны пафас і прарочы характар збліжае гэты твор з вершам У. Караткевіча “Вадарод” (1957), якім “паэт, нібы чуйны барометр, рэагаваў на магчымыя вынікі неразумнага выкарыстання энергіі вадароду” (А. Верабей). У кантэксце паслячарнобыльскай рэчаіснасці некалі проста элементы табліцы Мендзялеева будуць успрымацца як знішчальнікі жыцця. В. Зуёнак задоўга да аварыі ўбачыў дэталёва дакладную карціну радыёактыўнага стронцыевага дажджу: часператварыў верш-папярэджанне ў прагнастычна-футуралагічны прысуд – прысуд людской абыякавасці, якая абярнулася глабальнай непазбыўнай трагедыяй.

Цень атамнай катастрофы нябачна праходзіць ці не праз усе творы зборнікаў В. Зуёнка “Лета трывожных дажджоў” (1990), “Чорная лесвіца” (1992), “Пісьмы з гэтага свету” (1995) і паглыбляе драматызм светаадчування мастака. У зборніку 1990-га года вядучым становіцца вобраз трывожных дажджоў. Калі ў раннім вершы “Ідуць дажджы” вобраз дажджу меў футуралагічна-папераджальнае значэнне, то цяпер ён звязаны з драматычным роздумам над спраўджанай рэальнасцю. Так, менавіта дождж перасмяглым майскім прысадам замест наталення і збавення прыносіць страшную вестку: “Хмары не плылі, не ўдарыў звычна / Гром, што быў за Перуна старэй... / І Чарнобыль весткаю касмічнай / Стаў каля расчыненых дзвярэй...” (“Касмічная вестка”) (276). На думку Н. Заяц, “В. Зуёнак усведамляе глабальнасць трагедыі чарнобыльская бяда разглядаецца як галактычная катастрофа: у творы паўстае вобраз адзінокай і бездапаможнай сярод іншых планет Зямлі, якая шукае паратунку” [спасылка на мой артыкул Экалагічная…].

Эпіграфам да верша “Дождждык, дождждык, сыпані...” (зборнік “Чорная лесвіца”) паэт узяў радкі з дзіцячай заклічкі. Драматычны змест твора зусім непадобны на гарэзлівую фальклорную забаўлянку, і менавіта кантрастнасць стварае моцны эмацыйны эфект: “Я дажджынкам твар падстаўляў, / Я не думаў іх браць на пробу, / Я не знаў, што мне ў твар страляў / Ізатопнай шрапнеллю Чарнобыль” (324). Гэтаксама будуецца і паэма С. Законнікава “Чорная быль”: узятая з фальклору ў якасці эпіграфа для кожнага раздзела тэма раскрываецца ў ключы трагічнай сучаснасці, набывае зусім іншае значэнне і гучанне. Своеасаблівая апазіцыя гарманічнага фальклорнага мінулага і жахліва-абсурднага сённяшняга дня, калі спрадвечна жыццядайныя сілы становяцца згубнымі і варожымі для чалавека, узмацняе драматызм, падкрэслівае горыч неабарачальных стратаў. У вершы вельмі адчувальны сацыяльны пласт: з выпакутаванай усмешкай лірычны герой гаворыць пра цынічныя “суцяшэнні” і запэўніванні “міністраў-монстраў”,

падман сродкаў масавай інфармацыі (“Драбяза! Трошкі атамны дожджык папырскаў...”).

Сацыяльна-быційны аспект у асэнсаванні праблемы Чарнобыля вельмі часта суіснуе побач з маральна-гуманістычным і філасофскім. Увогуле чарнобыльская тэма, як і ваенная, сама па сабе ўжо эпічная, быційная, бо мае дачыненне да праблем агульнанацыянальнага і агульначалавечага характару.

Вершам “Урок паўтарэння” (зб. “Лета трывожных дажджоў”) В. Зуёнак апелюе да літаратурнага і культурна-гістарычнага кантэксту. Твор уяўляе рэмінісцэнцыю на знакаміты “Рэквіем па кожным чацвёртым” А. Вярцінскага. Не проста перагукваннем, а свядомай стылізацыяй пад “Рэквіем”, наследуючы яго трагічны пафас, В. Зуёнак прыраўноўвае дзве вялікія нацыянальныя бяды – ваенную і чарнобыльскую. Як паказвае “ўрок паўтарэння”, праведзены настаўнікам Чарнобылем, пасляваенны “ўрок спражэння” (“Я іду, ты ідзеш, а ён не ідзе, – ён мёртвы”), на жаль, не навучыў чалавека клапаціцца пра сябе самога і пра свет. Эпічная плынь займае значнае месца ў вершы, не захіляючы, аднак, лірычнага пачатку. Адбываецца самараскрыццё тэмы без бачнага “ўдзелу” аўтара. Трывожныя карціны нібы самі па сабе змяняюць адна адну: “Чуюць Хойнікі, чуе Брагін / Жураўліны крык ля аблок: / Ні расінкі – адолець смагу... / І – чацвёрты энергаблок” (277). Разам з тым прысутнасць аўтара вельмі адчувальная: у словах рэфрэна “чацвёрты энергаблок” яго голас гучыць магутна, набатам напамінаючы пра незасвоеныя ўрокі. Паэт нібы агучвае просьбу спакутаванага свету, а на самой справе перадае сваё, асабістае перажыванне: “устаньце, людзі, / Каб адолець ядзерны змрок, / Бо інакш – не жыццё ў нас будзе, / А чацвёрты энергаблок...” (278). Хацелася б верыць, што “ўрок паўтарэння” В. Зуёнка, як і ўрокі Р. Барадуліна, Г. Бураўкіна, А. Вялюгіна, Н. Гілевіча, А. Грачанікава, С. Законнікава, М. Мятліцкага, Я. Янішчыц і іншых паэтаў, вершы якіх сталіся першымі водгукамі на Чарнобыль, будзе ўрэшце засвоены і засцеражэ чалавецтва ад самавынішчэння.

У вершы “Пялёнкі над балконам” з гэтага ж зборніка паэт імкнецца пераадолець стан трывогі, выказвае веру ў перамогу дабра. Аптымістычныя спадзяванні навявае выгляд суседняга балкона з вывешанымі белымі квадратамі пялёнак, якія сімвалізуюць працяг жыцця. Паэт вітае з’яўленне новага чалавека, народжанага нібы насуперак знішчальнаму Чарнобылю. Апазіцыя “чорны – белы” (“смерць – жыццё”) вырашаецца на карысць жыццю. Тым не менш большасці вершаў на чарнобыльскую тэму ўласцівы далёка не аптымістычны пафас [спасылка на мой артыкул Экалагічная…].

Чарнобыльская тэма ў творчасці В. Зуёнка высвечваецца рознымі гранямі і выступае ў звязцы з праблемамі “духоўнага Чарнобыля”

(напрыклад, верш “Эфект лячэння”), бежанства з родных мясцін і неспакойнага маленства (“Свята паэзіі на радзіме Аркадзя Куляшова”) і іншымі. Праблема маральнай адказнасці перад светам прыроды і яго насельнікамі таксама не магла не прыцягнуць ўвагу паэта. Гэтая праблема цэнтральная і ў творах іншых пісьменнікаў, прадыктаваных паслячарнобыльскай рэчаіснасцю, прынамсі, у апавяданні І. Пташнікава “Львы” (1987), паэме С. Законнікава “Чорная быль” (1989). В. Зуёнак у вершы “Сцежка ласёў капытная...” (1989) малюе карціну бегства абпаленага “мірным атамам” лася, за якім бачыцца абагульнена-сімвалічны вобраз усяго жывёльнага свету. Гэта вельмі дынамічны, эмацыйна напружаны верш. Выкарыстаныя паэтам пры апісанні лася вобразы-дэталі надзвычай ёмістыя, уражваюць нечаканасцю: “Агонь у целе бушуе / Атамнаю агоніяй / І ў белакроўным шуме / Гоніць лася пагоняю. / І ўжо не бачыць дарогі, / Прэ напралом сахаты – / Рэактар чатырохногі, / Энергаблок рагаты... / Зляканыя крышыць дрэвы, / Паветра ўдыхае прагна, / І свеціцца падчарэвак / Радыяцыйнаю багнай” (325). Рытм і атмасфера імклівай пагоні перадаецца нават на фанетычным узроўні: чатыры разы паўтараецца ў адной страфе спалучэнне “го” – быццам нейкая вышэйшая злая сіла нахабна крычыць услед зверу, гоніць з родных мясцін, праследуе, не дае нідзе схавацца. Сапраўды, схавацца ад чарнобыльскай атруты жывому немагчыма, бо яна тоіцца ў кожнай клетачцы і раз’ядае знутры. Фінал твора трагічны: лось заблытаўся ў балотнай твані, дзе, пэўна, і загіне.

Сітуацыя тупіковасці, безвыходнасці, заблытанасці характэрная для многіх лірычных твораў, напісаных пасля красавіка 1986-га года. Прынамсі, лірычны герой верша “– А што ў цябе, бяроза, на сняданак?..” (зб. “Пісьмы з гэтага свету”) размаўляе з бярозай, лёсам якой стаў Чарнобыль: “– А што ў цябе, бяроза на сняданак? / – Самотны ранак, ветрам разгайданы. / – Тады заходзь, папі са мною чаю: / Ён ад адчаю часам выручае...” (360). Не лепшыя ў яе абед і вячэра – “Чарнобыль зноў і той жа смутак шэры”. Лірычны герой знаходзіцца ў стане разгубленасці і бездапаможнасці, таму што і ён такі ж заложнік і ахвяра красавіцкай трагедыі (“Тады і я цябе не пагукаю, / Бо сам, здаецца, толькі гэта й маю...”). Выкарыстаная паэтам форма дыялога паміж дрэвам і чалавекам ідзе ад наследавання фальклорнай традыцыі. Размова з бярозай аб страчаных на вайне сынах адбывалася і ў лірычнага героя больш ранняга верша “Помнік” (зб. “Крэсіва”), дзе ўжыты фальклорны прыём псіхалагічнага паралелізму: тут вобраз дрэва дапамог раскрыць унутраны стан маці, што не дачакалася сына. Калі ў “Помніку” паралель паміж бярозай і жанчынай відавочная, то ў вершы “– А што ў цябе, бяроза, на сняданак?..” яна адчуваецца ў падтэксце. Думаецца, тут бяроза можа ўспрымацца больш

шырока і абагульнена – як сімвал жаночага пачатку, вобраз маці-прыроды, атручанай Чарнобылем. Як вядома, для славянскай культуры характэрна замацаванне за дрэвамі пэўнага значэння, і менавіта бяроза ва ўяўленні нашых продкаў традыцыйна сімвалізавала жаночы пачатак. Такое прачытанне вобраза бярозы яшчэ больш узмацняе драматычны пафас верша, мадэлюе тупіковую сітуацыю, калі чалавек не здольны дапамагчы жыццядайнай прыродзе, выправіць сваіх памылак, а гэта пагражае знікненнем жыцця ўвогуле [спасылка на мой артыкул Экалагічная…].

Экалагічная тэма праходзіць праз усю творчасць В. Зуёнка. У яе асэнсаванні ён з самага пачатку выступаў неабыякавым, заклапочаным станам прыроды чалавекам. Непакой творцы аб навакольным свеце і яго насельніках неадлучны ад клопату пра захаванне душэўнай чысціні. Валодаючы дарам мастацкага прадбачання, пісьменнік перасцерагаў, што занядбанне законаў прыродна-касмічнага суладдзя можа абярнуцца вялікаю бядою. Калі вершы В. Зуёнка на экалагічную тэму 1960 – першай паловы 80-х гадоў заклікалі чалавецтва апамятацца, нярэдка падказвалі шляхі выйсця, для многіх паслячарнобыльскіх твораў становіцца характэрнай сітуацыя безвыходнасці, што сведчыць пра паглыбленне трагізму паэтавага светаадчування, пра перажыванне ім агульнай трагедыі як асабістай.

Сустрэчы з радзімай для паэтаў з пацярпелых раёнаў – балюча-шчымлівыя, пра што сведчаць вершы Віктара Яраца, Міхася Башлакова, Алы Канапелькі, Анатоля Зэкава, Эдуарда Акуліна і інш. У трыпціху «Адсяленне» Алесь Каско гаворыць пра вынікі чарнобыльскай навалы:

На ўскрайку роднага краю
Мала вёсак: адну за адной
Хвалі чорныя прыбіваюць
Іх да горада, як прыбой [18, с. 134–135].

Горкае пачуццё будзіць усхваляваны роздум. У асэнсаванні нябыту і быцця ён дасягае філасафізму:

А ў чым віна?..
Бяда-змяя
Ахвяру спавіла ў калысцы,
І – зноў крычала немаўля,
Як пры народзінах калісьці.
Не моўкне голас – з-пад зямлі,
З-пад траў і красак, з-пад дзірвання,
І нельга крык той адсяліць,
І страшна ад свайго маўчання [18, с. 136].

Чарнобыль зацемрыў свет, спарадзіў «маўчанне вялікае», але паэт на тое і паэт, каб пачуць голас роднай зямлі і крыкі дзіцяці. Віктар Ярац у надпрыпяцкім краі, дзе «побач... саркафаг», здаецца бы чуў голас самой сівой даўніны: «Каго ж, аб чым гукае голас тура // з мінуўшчыны, // дзе шчодры гул бароў?» («Пад ружаю вятроў»). Гэтае пытанне з мінулага скіравана да сучаснасці з думкай пра гістарычны час і пагрозу быццю на спрадвечнай зямлі «пад ружаю атручаных вятроў».

Кнігу Віктара Вабішчэвіча «Чорны боль» (2003) складаюць прачулыя паэтычныя маленні за родны край. У вершы «Нараджэнне болю» ён стварае вобраз хіжага чорнага птаха – хаўрусніка смерці:

А ў людзей пусцеюць душы,
Чэзне, нікне ўсё паволі.
Птах жыццё знішчае, душыць
Засявае чорным болем .
«Чорны боль» [9, с. 45].

Невыпадкова свой верш Таіса Мельчанка назвала менавіта так – «Распад душы». Паэты ўсё больш адчуваюць пагрозу іншага Чарнобыля – духоўнага, і таму так устрывожана гучаць іх галасы. Як глыбока вынашанае пачуццё выказвае Т. Мельчанка сваё разуменне галоўнага, сутнаснага ў час, калі «магільная ціша стаіць у чарнобыльскай зоне» і «пачаўся распад чалавечай душы». Трывога яе пра тое, «каб часцінку жывога мы ўсё ж не аддалі на глум».

Мікола Арочка ў вершы «Чарнобыль і мова» сцвярджае, што чалавек, «прынукаю пастаўлены ў аглоблі... свой мулкі горб падставіў пад Чарнобыль» [, с.].

Беларусам у чарговы раз выпала несці крыж бяды і пакутаў, цяжар людскіх страт. На чарнобыльскі алтар давозіцца аддаваць самае роднае і непаўторнае: родную хату, калыску, красу прыроды. Чарнобыльская катастрофа ўзмацніла ў людзей трагічнае самаадчуванне. З’явілася пачуццё безвыходнасці перад тварам радыяцыйнай смерці, якая ўзнялася над беларусамі.

Адзін з тых, чые родныя мясціны пасыпаў атрутны попел, – Віктар Стрыжак. Ён працаваў у веткаўскай райгазеце. Там, у Ветцы, набраў радыяцыйную дозу, небяспечную для жыцця. Пасля паэт пераехаў у Мінск, дзе раптоўна памёр у 1994 г. (пахаваны ў роднай вёсцы Заспа Рэчыцкага раёна). Паэт А. Шушко прысвяціў памяці сябра верш пад назвай «Чацвёрты блок у сэрцы Стрыжака». Віктар Стрыжак аднойчы прызнаўся:

– Ведаеш, сябрук, відаць, мёртвым
Апынуся ў роднай старане.

У мяне не сэрца – блок чацвёрты.
Грудзі распірае магма мне... [18, с. 177 ].

В. Стрыжак – аўтар вершаў пра родны край, які напаткала чарнобыльская згуба. Ён маркоціўся, блізка да сэрца прымаў людскую бяду. Чарнобыльская ява палохала чулае сэрца паэта: «Пазіраю на крыжы: // Смерць за намі ходзіць...». Чарнобыль не здолеў вытруціць у душы паэта пачуццё радзімы, яго па-ранейшаму прыцягваў «сяла пад Рэчыцай... магніт», хоць «брудны свет» палохаў і стала ў ім «цяжка жыць» (вершы «Магніт», «Свету»). Заўчасны адыход з жыцця паэта сведчыць пра бязлітасны кон Чарнобыля.

Чарнобыль атруціў прыроду, разбурыў адвечнае ўладкаванне нацыянальнага космасу, звузіў «ландшафтнае існаванне» народа. Атамная АЭС уяўляецца паэтам як пачвара, монстр, дэманічна-злавесная сіла. Вось якое змрочнае персаніфікаванае аблічча Чарнобыль набыў у вершы Галіны Каржанеўскай «Ненапісаны верш»:

Палынная зорка
Ўзышла над маёю зямлёю...
Мне бачацца вёскі пустыя
Ды жудасны горб саркафага.
Пужае і сёння гарбун
З яго непатухшаю люлькай [18, с. 99].

Чарнобыль адбіўся на мастацкім светаадчуванні, якія спарадзіў эстэтычныя феномены і тэндэнцыі. «У нашых песнях – // Небяспечны стронцый», – у гэтых словах з верша Максіма Танка [18, с. 89]. «Цяпер асцерагайцеся» выявілася якасна новае светаразуменне. Пасля Вялікай Айчыннай вайны наша нацыянальная літаратура яшчэ не ведала такой канцэнтрацыі болю і трагізму. У друку з'явіліся шчымлівыя элегіі і балады, песні-плачы і малітвы, нарысы і публіцыстычныя паэмы, аўтабіяграфічныя апавяданні і дзённікі, раманы пра Чарнобыль... Літаратура на чарнобыльскую тэму створана рознажанравая. Яна надзённая, вострапраблемная, раскрывае з'явы нашай сучаснасці і ўнутранае самаадчуванне чалавека, які зведаў страх радыяцыйнай пошасці. За апошнія дваццаць гадоў беларуская літаратура рухалася ад паэтычных слоў смутку, перасцярогі і трывожных уражанняў да глыбокага філасофска-гуманістычнага асэнсавання трагедыі. У сённяшняй паэзіі і прозе ўзрасла псіхалагічная выяўленчасць і эсхаталагічная значнасць думкі.

Беларуская літаратура адлюстравала агульнанародную бяду і трагедыю асобнага чалавека з рэалістычнай праўдзівасцю, бязлітасна-суровай дакументальнасцю.

Чарнобыль – гэта доўгая крыжовая дарога, таму так часта чуюцца ў творах паэтаў матывы трывожнага роздуму пра будучыню. Яна ж, тая будучыня, поўная безвыходнасці, невядомасці. Паэты задаюць нам сурова-горкія пытанні, якія трывожаць свядомасць, прымушаюць сціскацца сэрца ад усведамлення нясканчанасці жудасных наступстваў. З цяжкай унутранай прыгнечанасцю прамаўляюцца словы-запытанні: «Якім дыханнем новы дзень напоўняць // вада, трава і кнігаўкі ў траве?» (В. Ярац. «З лугоў настой зімовы змые пойма...»). стаў «атамнай вайной», якая няўмольна патрабуе ахвяр і асабліва не шкадуе дзяцей. Радыяцыйнае апраменьванне нябачна і ціха падточвае здароўе тых, хто жыве сёння ў забруджаных мясцінах. Расплачвацца за безадказнасць даводзіцца нявінным, плаціць па самым вялікім рахунку, і самае жахлівае – людскімі жыццямі. На чарнобыльскую тэму з'явілася звыш 500 вершаў.

Сёння праблема захавання беларускай мовы, маральных каштоўнасцей напрамую звязваецца з чарнобыльскай бядой. Сляпое занядбанне культуры і гістарычнай самабытнасці, выраканне беларускасці гэтак жа, як і яд Чарнобыля, пагражае прынесці нашаму краю і яго народу дзікую немачць, змрочны дзень бяспамянтва і забыцця. Духоўны Чарнобыль разбурае і нішчыць у чалавеку самае галоўнае – чалавечнасць. Ды і атамная аварыя здарылася не раптоўна, яна пачалася таксама з трагедыі ў самім беларусе, які перастаў адчуваць сябе на зямлі паэтам і гаспадаром, сынам і патрыётам.

Страшная, балючая рэчаіснасць патрабуе новых поглядаў і падыходаў да праблемы Чарнобыля, яе асэнсавання. І ў гэтым плане, значная роля належыць мастакам слова. Беларускія паэты і пісьменнікі зведалі і боль, і горыч у пошуках ісціны, праўды пра вялікую бяду ў нашым краі.

## РАЗДЗЕЛ II Адметнасці мастацкага ўвасаблення чарнобыльскай тэмы ў паэтычным эпасе

На паэтычную авансцэну канца XX – пачатку XXI ст. выходзіць шэраг паэм, прысвечаных Чарнобылю. Красавіцкая трагедыя 1986 г. паўстае змрочным сімвалам нацыянальнай бяды – ім пазначаны і творы іншых тэматычных кірункаў.

Сярод першых у нацыянальным ліра-эпасе на гэту падзею адгукнуўся С. Законннікаў. Паэма «Чорная быль» (1989) складаецца з трынаццаці раздзелаў (відавочна, што аўтар невыпадкова спыніўся менавіта на гэтай лічбе), кожнаму з якіх папярэднічае фальклорны эпіграф. Абазначаная радкамі народных песень і прымавак тэма праецыруецца на паслячарнобыльскую рэчаіснасць, набываючы зусім іншае значэнне і гучанне. Так, напрыклад, словы калыханкі «Прыйдзе шэранькі ваўчок, // Схопіць дзетку за бачок» папярэджваюць усхваляваны аповед пра апрамененага ваўка, які не можа пазбавіцца нясцерпнага болю і пакут: «Так ляжаў ён, распяты натугаю нечай, // Што сціскала за горла люцей і люцей. // Не звярынай слязой, а святой, чалавечай // Плакаў той, кім палохаюць людзі дзяцей» (Законнікаў 1989, 8). Як і апавяданне І. Пташнікава «Львы» (1987), верш В. Зуёнка «Сцежка ласёў капытная...» (1989), раздзел паэмы «Чарнобыльскі воўк» прасякнуты пачуццём маральнай адказнасці і віны перад прыродай і яе насельнікамі. Вобраз забітага «мірным» атамам ваўка выступае мастацкім увасабленнем усяго жывёльнага свету.

Чарнобыль ўзрушвае сваім трагізмам чалавечую свядомасць. Пасля Чарнобыля пра Беларусь даведаліся ў розных краінах свету. Гэты розгалас шырыцца дзякуючы і нашай нацыянальнай літаратуры. У Польшчы пабачыла свет кніга С. Законнікава «Чорны конь апакаліпсісу» (1996), у якую ўвайшлі паэмы «Чорная быль» і «Зязюля». Беларускі аўтар уганараваны міжнароднай прэміяй імя Вітольда Гулевіча (польскага паэта, расстралянага гітлераўцамі ў 1941 г.) «за чарнобыльскія паэмы, якія ўзнімаюць драматычныя праблемы сучаснасці і асабісты ўклад у дапамогу ахвярам катастрофы» [, с.].

С. Законнікаў у паэзіі ўспрымае аварыю на АЭС як жахлівую экалагічную катастрофу, якая нясе беларусам нечуваныя выпрабаванні. Мераю Чарнобыля ён вымярае наш учарашні гістарычны дзень, высвечвае сённяшні стан грамадства і лёс чалавека ў ім (раздзелы «Марадзёры», «Страх» і іншыя). Паэт устурбаваны тым, што народ страціў свой голас і пачуццё ўласнага «я», важнейшыя маральныя, духоўныя арыенціры, не выпрацаваў нацыянальны імунітэт.

Паэт папярэджвае пра духоўны, нацыянальны Чарнобыль. Паэма мае моцны драматычны напал радка. Балявое «я» паэта, асабістае пачуццё адказнасці за жыццё на роднай зямлі знітоўвае ўсе раздзелы твора ў адзінае цэлае – згустак вялікага болю і трывогі. Там, дзе народ не гаспадар сваёй зямлі, дзе няма нацыянальнага ўсведамлення, лёгка адбыцца непапраўнай бядзе. У Біблії ёсць такія словы: «Трэці Анёл пратрубіў, і ўпала з неба вялікая Зорка, якая гарэла падобна свяцільні».

Гэтай жа тэме прысвечаны сімвалічны твор С. Законнікава «Чорная быль» Паэма складаецца з 13 міні-частак: «Выбух», «Зона маўчання» і іншыя Колькасць раздзелаў, як думаецца, сімвалічная. 13 – лічба ракавая, д'ябальская, яна нібы сама чарнобыльская бяда-навала, якая абрынулася на наш народ. Паэт увасабляе злавесны воблік Чарнобыля, які атруціў усё жывое, асудзіў на выгнанне людзей, адабраў у іх будучыню. І ў той жа час ён яскрава высвечвае заганы нашага грамадства, выказвае ўласную грамадзянскую пазіцыю, звяртаючыся да беларусаў:

Калі ж і зараз ты не загукаеш,
А будзеш жыць пад страхам і прынушай,
Чарнобыль не такі яшчэ чакае
Тваю зямлю, шваіх дзяцей і ўнукаў [16, с. 53].

С. Законнікаў у паэме «Чорная быль» спрабуе асэнсваць прычыны трагедыі, заклікае да барацьбы з безадказнасцю і беспрынцыповасцю, папярэджвае аб наступленні духоўнага Чарнобыля. Чарнобыльская трагедыя – боль, смутак, крык чалавечай душы, плач, выміранне. А яшчэ гэта пакаранне за нашы недарэчныя ўчынкі, безгаспадарлівыя адносіны да ўсяго навакольнага [ 2, с. 156–165].

Драматычным напалам, пачуццём адказнасці за ўсё, што і адбываецца на роднай зямлі, патрабаваннем праўды жыцця, няхай суровай і горкай, поўняцца радкі паэмы С. Законнікава:

Маўчыць, нібы камень, зямля,
Палын невядомасцю свеціць...
Што будзе, што будзе пасля? –
Не скажа ніхто ў гэтым свеце.
Ёсць праўда адна – праўдай жыць,
Няхай і суровай і горкай...
У небе над намі стаіць
Як зніч, палыновая зорка [16, с. 54].

Па назіранні Н. Заяц, «у ліку іншых ракурсаў у асвятленні тэмы акрэсліваюцца праблемы бежанства з родных мясцін і адабранага краю («Трэці анёл», «За калючым дротам», «Вяртанне»), «украдзенага» маленства

(«Чаравічкі», «Пераліванне крыві»), «балю ў час чумы» («Марадзёры»), матыў уласнай віны за рабскую пакорлівасць народа, за Курапаты, Салаўкі і Калыму («Віна»)» [спасылка на мой артыкул Мастацкае асэнсаванне]. Выбух на атамнай станцыі, акцэнтуе ўвагу аўтар, абярнуўся не толькі экалагічнай, але і гуманітарнай катастрофай, з'явіўся горкім апафеозам традыцыйна-беларускай маўклівасці і абыякавасці да свайго лёсу («Страх»). У злавесным святле «палыновай зоркі» востра паўстае праблема захавання народа – С. Законнікаў настойліва праводзіць думку пра магчымы духоўны Чарнобыль, спадзяецца засцерагчы суайчыннікаў ад нацыянальнага апакаліпсісу: «Калі ж і зараз ты не загукаеш, // А будзеш жыць пад страхам і прынукай, // Чарнобыль не такі яшчэ чакае // Тваю зямлю, тваіх дзяцей і ўнукаў…» (Законнікаў 1989, 10).

Праз дзесяцігоддзе пасля аварыі паэт зноў звяртаецца да той жа тэмы – вынікам мастакоўскага роздуму стала паэма «Зязюля» (1996), прысвечаная земляку В. Быкаву. У адрозненне ад папярэдняга ўвага літаратурнай крытыкі да гэтага твора і рэзананс ад яго былі меншымі, аднак па сваіх мастацкіх вартасцях і глыбіні паэтычнага даследавання тэмы «Зязюля» ніяк не саступае паэме «Чорная быль», а можа, нават у нечым і пераўзыходзіць яе. С. Законнікаву ўдалося ўзняцца на новую ступень творчага спасціжэння праблемы духоўна-нацыянальнага Чарнобылю, якая выходзіць на першы план. Словы перасцярогі, выказаныя ў паэме «Чорная быль», у «Зязюлі» – рэальнасць: беларусы па-ранейшаму ўсведамляюць сябе не народам, а «маленькімі людзьмі вялікай бяды», «змірыліся з гэтым, не рвуцца на волю», «загналі цвікі» ў дзяржаўную мову, «прадажныя ўнукі» не сняць сны аб Беларусі [спасылка на мой артыкул Мастацкае асэнсаванне].

Філасофскія развагі, выкліканыя спраўджаным духоўным Чарнобылем, у спалучэнні з публіцыстычнасцю і грамадзянскасцю, характэрнымі для творчага почырку паэта, ствараюць моцны эфект – сэнсавы, пачуццёвы, эстэтычны. Калі ў першым ліра-эпічным творы пераважае выяўленчасць – паэт узнаўляе драматычныя жыццёвыя эпізоды, у якіх ужо закладзены вялікі патэнцыял эмацыянальнага ўздзеяння, – то тут дамінуюць роздумнасць, аналітызм.

Пластычныя малюнкі і вобразы не адназначныя – яны набываюць сімваліка-алегарычны сэнс і дапускаюць магчымасць розных інтэрпрэтацый, асабліва цэнтральны вобраз зязюлі, які ўзнікае ў большасці з семнаццаці раздзелаў-частак. Зязюля ў паэме – гэта і мёртвы птах у брагінскім лесе, што можа разглядацца як сімвал атручанай радыяцыяй зямлі; гэта і маці, якая пасля смерці маленькага сына ператварылася ў птушку і днюе-начуе на «памаладзелых» за апошнія гады могілках. Семантыка вобраза ўрэшце

пашыраецца да вобраза беспрытульнай Радзімы: «Беларусь – гаротная зязюля, // Як і ў той, няма ў цябе гнязда. // Ты суседзям дзетак падкладала, // Выраслі – ведаў пра іх свет! // А сама пад крылы захінала // Пустадомкаў нашых і чужых» (Законнікаў 1996, 71). Зязюля – «заведзены Богам гадзіннік жыцця» – увасабляе і надзею паэта на будучыню, на нязводнасць беларусаў, на тое, што народ не патушыць «свечку сваёй душы».

Па архітэктоніцы паэма «Зязюля» падобная на «Чорную быль»: складаецца з адносна самастойных сэнсавых частак, дзе даследуюцца асобныя падтэмы. С. Законнікаў і тут творча выкарыстоўвае фальклорную паэтыку: народна-песенныя вобразы (зязюля), матывы (ператварэнне ў птушку), мастацкія прыёмы (адухаўленне прыродных з'яў), арганічна ўключаныя ў аўтарскі тэкст, ствараюць асаблівую, пранікнёную, атмасферу. Гэтаму спрыяе і пераймание фальклору на рытміка-інтанацыйным узроўні («Ку-ку», «Сучасная балада», «У зоне», «Беларуская песня»). У стылізаваны «пад народнае» твор натуральна ўключаюцца біблейскія матывы і вобразы («Крыж», «Мадонна», «Свечка»). Новым, па-мастацку выразным і экспрэсіўным падаецца параўнанне Беларусі з мармуровай скульптурай мадонны – «без галавы, без рук, без ног». Акрамя таго, з мэтай абуджэння нацыянальнай свядомасці аўтар апелюе да гістарычнага мінулага: успамінае пераможную Грунвальдскую бітву, згадвае велічных асоб – Еўфрасінню Полацкую, Францыска Скарыну, Янку Купалу, якія ўжо традыцыйна ў нашай літаратуры з'яўляюцца патрыятычна-адраджэнскім ідэалам. Гарманічным выглядае ўвядзенне ў тэкст літаратурных рэмінісцэнцый, у прыватнасці, на творы Я. Купалы, М. Багдановіча. Як відаць, у паэме сумяшчаюцца розныя прыёмы арганізацыі мастацкай формы, выяўляецца жанрава-стылявы дынамізм, што ўласціва сучаснай паэзіі ўвогуле[спасылка на мой артыкул Мастацкае асэнсаванне].

Кальцавая кампазіцыя стварае выразны малюнак і прадвызначае сэнсавую завершанасць твора. Паэму адкрывае раздзел «На беразе тым»: на тым беразе ракі часу зямля была «чыста-ўрачыстай», сонца, як маці, а вецер, як тата, забаўляліся з лірычным героем. У заключным раздзеле «На беразе гэтым» паўстае жахлівая карціна экалагічнага і духоўнага Чарнобылю: «На беразе гэтым – часіна распаду. // Зямлю запаланілі зноў чужакі – // Палоній і ліцій, рутэній і радый // Смяротны свой баль будуць правіць вякі. // На беразе гэтым – нязбытнае гора, // Прычына бясконцых, нязлічаных страт. // Хварэе народ, бо не сёння, не ўчора // Душы беларускай пачаўся распад» (Законнікаў 1996, 77). Узнікае бінарная апазіцыя той/гэты як супрацьпастаўленне дачарнобыльскай і паслячарнобыльскай эры, гармоніі і хаосу, духоўнасці і чэрствасці. Тым не менш, нягледзячы на агульную мінорную танальнасць і

драматычны пафас, у фінале твора выразна гучыць матыў веры ў лепшае: «А покуль ёсць сілы – усё я трываю, // І веру ў розум, у вечны працяг…» (Законнікаў 1996, 77). Думаецца, паэма «Зязюля» ў ліра-эпасе на чарнобыльскую тэму з'яўляецца адным з найбольш значных па сіле эмацыянальнага ўплыву, таленавітых і па-мастацку дасканалых твораў, які яшчэ чакае спецыяльнага літаратуразнаўчага аналізу.

Як агульначалавечую, экзістэнцыяльную, а не толькі нацыянальную праблему разглядае чарнобыльскі выбух і яго наступствы Я. Сіпакоў у паэме ў прозе «Одзіум» (1990). Чарнобыль стаў для людзей, і найперш для беларусаў, одзіумам – «прадметам нянавісці і нараканнняў», праз які прайшлі мільёны і ад якога немагчыма пазбавіцца. Пісьменнік стварыў «эпічна-драматычную, маштабную карціну экалагічнай катастрофы» (Бельскі 2003, 68), у паэме паўстаюць вобразы «двух братоў і сястры з нетутэйшымі імёнамі – Катаклізм, Апакаліпсіс і Катастрофа» (Сіпакоў 1996, 300). Аўтар падкрэслівае жахлівую абсурднасць паслячарнобыльскай рэчаіснасці, дзе звычайны ход рэчаў парушаны, прыродныя з'явы – дождж, вецер, аблокі – мяняюць сваю сутнасць: тое, што раней несла жыццё, цяпер наскрозь пранізана смерцю. Канцэптуальнае значэнне набываюць вобразы мёртвай прыроды, «зямлі за калючым дротам», матыў неаб'яўленай вайны, калі вораг нябачны і непераможны, вобраз «дзяцей радыяцыі», лёс якіх не лягчэйшы за лёс «дзяцей вайны». У творы шмат каларытных і пераканальных мікравобразаў: пчалы – «маленька-вялікай атамнай бомбы», семка – «неўтаймоўнага рэактара», яблыка, які «хоць і не міна, а забівае».

Цэнтральным, «сюжэтаўтваральным» выступае вобраз-персанаж бабкі Параскі, што не можа зразумець, чаму яе такое чысценькае цялятка называюць брудным. Урэшце старая спрабуе замежным парашком змыць з цяляці нябачны атамны бруд, пра які нічога не ведае, бо не чытае газет і не слухае радыё. «І бабуля закасвае рукавы і доўга шаруе дэфіцытным парашком такую цёпленькую ад чыстага сонца поўсць цялятка. // Пыску яму шаруе, спінку яму шаруе, ножкі яму шаруе, хвосцік яму шаруе…» (Сіпакоў 1996, 319). Па меркаванні Н. В. Заяц, гэтая сцэна – эмацыянальна-сэнсавая кульмінацыя і ці не самы кранальны эпізод твора. Пажылая жанчына (як і ў паэмах С. Законнікава «Чорная быль», В. Зуёнка «Падарожжа вакол двара») увасабляе здаровы, народны, канкрэтна-пачуццёвы погляд на свет, у які не ўкладваюцца непрадказальныя «здабыткі» сучаснага псеўдапрагрэсу [спасылка на мой артыкул Мастацкае асэнсаванне].

Асноўным стылістычным прыёмам, што вызначае паэтыку твора, з'яўляецца антытэза – супрацьпастаўляюцца дзве эпохі, да і пасля трагедыі: «Была, ці чуеце, вёска, а стала зона адсялення. // Было поле, а стала зона

адчужэння. // Быў лес, а стала зона пастаяннага радыяцыйнага кантролю. // Былі грады, а стала зона перыядычнага дазіметрычнага кантролю» (Сіпакоў 1996, 303). Паўтарэнне адных і тых жа слоў, перыядычнасць структуры тэксту ўзмацняюць эмацыянальнасць аўтарскага аповеду. Фраза-рэфрэн «Чорная быль – Чарнобыль. // Чорны баль – Чарнобаль. // Чорная бель – Чарнобель. // Чорны боль – Чарноболь» (Сіпакоў 1996, 301) выяўляе агульную настраёва-колеравую гаму твора, і на гэтым чорным фоне цямнеюць нават яркія фарбы-дэталі.

Наватарскай бачыцца структурна-фармальная рэалізацыя творчай задумы – кампазіцыйным «каркасам» выступае хрысціянская малітва «Ойча наш», якая пастаянна перарываецца аўтарскім тэкстам. Празаічная мова ў многім спрыяе праяўленню ў творы стылявога сінкрэтызму: сумяшчаецца лексіка розных пластоў (памяншальна-ласкальныя, словы зніжанай стылістычнай афарбоўкі, спецыяльная лексіка), уводзяцца лічбавыя дадзеныя, гістарычныя даведкі. Апошнія адначасова дакументалізуюць паэтычны аповед і выконваюць важную ідэйна-мастацкую функцыю – уздзеянне на свядомасць і пачуцці. Так, уражвае ўстаўны эпізод пра японскіх хібакусі – ахвяр атамных бамбардзіровак, асуджаных на мутацыю і павінных жаніцца толькі паміж сабой. Аналогія паміж хібакусі і беларусамі – адна з найбольш выразных і змрочных метафар для вызначэння будучыні нацыі не толькі ў творы, але і ва ўсёй сучаснай паэзіі. Я. Сіпакоў закранае і праблему беларускай ментальнасці: спагадлівы да чужой бяды народ заўсёды гатовы дапамагчы іншым, але абыякавы да сябе і сваіх дзяцей.

Праблема нацыянальнага характару на фоне экалагічнай катастрофы востра паўстае ў паэме В. Зуёнка «Падарожжа вакол двара» (1989–1990). Гэты твор завяршае ліра-эпічную пенталогію «Пяцірэчча» (1965–1990), куды, акрамя яго, уваходзяць паэмы «Сяліба» (1965–1970), «Прыцягненне» (1978–1979), «Маўчанне травы» (1974–1978), «Лукам’е» (1980–1983). У звязцы з чарнобыльскай тэмай у «Падарожжы вакол двара» выяўляецца яго лейтматыў – самабежанства са свайго двара. Роспачны плач перасяленцаў-бежанцаў чуўся лірычнаму герою ў гады ваеннага маленства, яшчэ больш балюча ўспрымаецца ім гора вымушаных перасяленцаў-«чарнобыльцаў» у мірны час. Іншая, не менш важная і трагічная грань праблемы – добраахвотнае адмаўленне ад свайго двара вяскоўцаў, зваблены марамі аб гарадскім Эдэме. У выніку маштабнай па размаху акцыі – перасялення моладзі ў гарады – многія вёскі аказаліся пакінутымі, а разам з гэтым стала забывацца народна-сялянская мараль. Яшчэ адной іпастассю праблемы з’явілася ледзь не татальнае «самабежанства» ад сваёй мовы, культуры. Усё гэта прывяло да страты гістарычных каранёў, занядбання культурнай памяці,

беларус перастаў адчуваць сябе гаспадаром на ўласнай, бацькоўскай зямлі: «Мы як прышэльцы на сваім двары, // Мы бежанцы ў сваёй уласнай хаце...» (Зуёнак 1992, 317).

Структурныя часткі паэмы – разрозненыя фрагменты, асобныя вершы, якія «занатоўваюць» праявы сучаснага свету, – злучаюцца ў цэлае адзіным матывам страты. Яшчэ да Чарнобыля чалавек пачаў страчваць сувязь са сваім прыродным домам. Дыхатамія «прырода – цывілізацыя» ў паэме «Падарожжа вакол двара» цесна спалучана з апазіцыямі «мінулае – сучаснасць», «вёска – горад»; прыроднае (гэта значыць гарманічнае, духоўнае) мінулае змяняецца цывілізаванай (утылітарна-прагматычнай) сучаснасцю – з засухамі, мёртвымі крыніцамі і рэкамі, загубленымі лясамі. Гэта расплата за той самападман, якім цешылася чалавецтва, верачы ў неабходнасць і справядлівасць удасканалення тысячагоддзі існуючага свету [спасылка на мой артыкул Мастацкае асэнсаванне].

Экалагічная тэма па-рознаму вар'іруецца на працягу ўсяго твора, аднак яна не асноўны аб'ект мастацкага даследавання – праблемна-тэматычныя абсягі паэмы намнога шырэйшыя. Па глабальнасці, значнасці, надзённасці ўзнятых праблем «Падарожжа вакол двара» вылучаецца сярод разгледжаных раней твораў: яна з'яўляецца сапраўдным народным эпасам канца ХХ ст., дзе па-філасофску асэнсоўваюцца субстанцыйныя пытанні жыцця сучасных беларусаў. В. Зуёнак акцэнтуе ўвагу на вострых праблемах сучаснасці, шукае іх карані, рэаліі сённяшняга дня ставіць у шырокі гісторыка-культурны кантэкст.

У шэрагу твораў на экалагічную тэму можна разглядаць і філасофскую «Паэму пагашаных люстэрак» (1981, 1991) А. Разанава. Тут адсутнічае сюжэт у традыцыйным разуменні, не ўказваюцца часава-прасторавыя каардынаты, сацыяльная прывязка выяўляецца апасродкавана – праз сістэму індывідуальна-аўтарскіх метафар, нешматлікіх штрыхоў-накідаў з рэчаіснасці. Мастацкі свет твора структураваны шэрагам адцягнена-паняційных вобразаў: «І карцела // лязу калізій // ўцяцца ў думку і ў пачуццё. // Homo sum – // У Чырвонай кнізе // прачытаю сваё жыццё» (Разанаў 1995, 39). Грамадская ж праблема, што выклікала роздум пісьменніка, маркіруецца «рэальнымі» мікравобразамі «небяспечных хлеба, вады», «пустых вёсак, абязлюднелых двароў». Адметнасць разанаўскай філасофскай паэмы – ва універсальнасці яе зместу, у магчымасці інварыянтных «дэшыфровак» мастацкай ідэі. Твор можа інтэрпрэтавацца і як асабістая споведзь паэта, і як водгук на сацыякультурныя праблемы (занядбанне вёскі), і як развагі над экалагічнымі пытаннямі (апошні складнік ідэйнага зместу асабліва актуалізуецца пасля Чарнобыльскай аварыі). Праца

над паэмай пачалася яшчэ да выбуху, аднак вынесеная ў загаловак метафара пагашаныя – без жыцця, без агню людскіх позіркаў – люстэркі гранічна дакладна ўвасабляе трагедыю апусцелых пасля атамнай катастрофы мясцін, адабранага краю, спустошанага гнязда. Гэта дае падставы гаварыць пра футуралагічна-папераджальную сутнасць твора, пра імкненне аўтара вывесці паэтычную думку на пазачасавыя, метафізічныя абсягі.

Паказальна, што пісьменнікі розных літаратурных пакаленняў не абмяжоўваюцца мастацкім даследаваннем праблемы Чарнобылю – яна паўстае эмацыянальным імпульсам для аўтарскіх разважанняў над лёсам нацыі і свету. У прааналізаваных тэкстах С. Законнікава, Я. Сіпакова, В. Зуёнка, А. Разанава найбольш выразна выяўляюцца асноўныя тэндэнцыі ў асваенні тэмы сучасным ліра-эпасам. Адметнымі характарыстыкамі паэм выступаюць праблемна-тэматычная сінтэзнасць, кантамінацыя жанрава-стылявых прыкмет, спалучэнне традыцыйнага і наватарскага, публіцыстычнасці і філасафічнасці, паглыбленне роздумна-аналітычнага пачатку. Разгледжаныя творы сталі значнай з’явай у літаратурным жыцці, істотна разнастаілі, папоўнілі і ўзбагацілі набыткі беларускага паэтычнага эпасу ХХ ст.

1. Заяц, Н. Экалагічная праблематыка ў лірыцы Васіля Зуёнка / Н. Заяц // Роднае слова. – 2005. – № 1. – С. 17–21.
2. Бельскі, А.І. Паэзія / А.І. Бельскі // Гісторыя беларускай літаратуры ХХ стагоддзя : у 4 т. Мн., 2003. Т. 4. Кн. 2: 1986–2000. С. 39–87.
3. Законнікаў, С. Зязюля : паэма / С. Законнікаў // Полымя. – 1996. – № 4. – С. 64–77.
4. Законнікаў, С. Чорная быль : паэма / С. Законнікаў // ЛіМ. – 1989. – 21 крас. – С. 8–10.
5. Зуёнак, В. Чорная лесвіца : вершы і паэма / В. Зуёнак. – Мінск, 1992.
6. Разанаў, А. Паляванне ў райскай даліне / А. Разанаў. – Мінск, 1995.
7. Сіпакоў, Я. Одзіум : паэма Я. Сіпакоў // Прайсці праз зону : проза, паэзія, публіцыстыка. – Мінск, 1996. – С. 300–320.
8. Заяц, Н.В. Мастацкае асэнсаванне чарнобыльскай трагедыі ў сучасным ліра-эпасе / Н.В. Заяц // Весн. Беларус. дзярж. ун-та. Сер. 4. Філалогія. Журналістыка. Педагогіка. – 2009. – № 1. – С. 36–39.
9. Зуёнак, В. Выбраныя творы : у 2 т. / В. Зуёнак. – Т. 1. Гронка цішыні : выбр. вершы. – Мінск : Маст. літ., 1996.